# Гомельскі універсітэт






ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 18 (840) | Аўторак, 10 лістапада 1992 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 10 кап.


## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

У апошні чацвер кастрычніка адбылося чарговае пасяджэнне вучонага савета універсітэта. Па дакладу намесніка дэкана П. М. Чайкуна абмеркавана пытанне аб рабоце кафедр філалагічнага факультэта па вырашэнню праблем адраджэння беларускай культуры.

Даклад старшыні спартклуба Д. М. Жаркова датычыўся стану аздараўленча-спартыўнай работы ва універсітэце.

Вучоны савет вырашыў пытанне аб адкрыцці ва універсітэце аддзела міжнародных сувязей.

На парадку дня зацверджаны вучэбны план па спецыяльнасці «Знешнеэканамічная дзейнасць», удакладнена адна з тэм кандыдацкай дысертацыі, прынята рашэнне аб дэпаніраванні навуковых артыкулаў.

Вучоны савет на конкурснай аснове разгледзеў кадравыя пытанні. Загадчыкамі кафедр абраны: псіхалагічнай дыягностыкі і давузаўскай падрыхтоўкі — дацэнт **А. А. Лытко**, фізічнага выхавання — дацэнт **В. А. Каляда**; прафесарам кафедры гісторыі Беларусі — доктар гістарычных навук **Э. М. Энцін**. На пасаду дацэнтаў выбраны **А. В. Уласаў** — па кафедры псіхалагічнай дыягностыкі і давузаўскай падрыхтоўкі, па кафедры тэарэтычнай фізікі — **В. В. Андрэеў, С. Р. Шульга**, па кафедры філасофіі — **В. І. Краўцова**, па кафедры агульнага, рускага і славянскага мовазнаўства — **А. Ф. Рогалеў**. Старшымі выкладчыкамі абраны: **Н. Б. Асіпенка** — па кафедры матэматычных праблем кіравання, **С. І. Буракоўская** — па кафедры матэматычнага аналізу, **І. М. Елісеева, В. П. Цаленчук** — па кафедры псіхалагічнай дыягностыкі і давузаўскай падрыхтоўкі, **Т. К. Канавалава** — па кафедры фізічнага выхавання, **Л. П. Дзелідовіч, І. І. Лячак** — па кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці, **М. Д. Грудніцкі** — па кафедры філасофіі, **П. П. Верасовіч** — па кафедры дыфураўненняў, **В. С. Новак** — па кафедры беларускай літаратуры.

Вучоны савет па выніках галасавання прыняў рэкамендацыі аб прадстаўленні загадчыка кафедры дыфураўненняў **У. І. Міроненкі** да прысваення вучонага звання прафесар, **Т. Я. Зверавай** з гэтай жа кафедры і **У. А. Сізоненкі** з кафедры гісторыі Беларусі да вучонага звання дацэнт.

*З XII справаздачна-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі студэнтаў*

## ЦІ АБАРОНЕНЫ СЁННЯ БУДУЧЫ СПЕЦЫЯЛІСТ?

НА СВАЮ чарговую XII справаздачна - выбарную прафсаюзную канферэнцыю студэнты універсітэта сабраліся ў нялёгкі для ўсяго нашага грамадства час. За тры гады, якія мінулі пасля правядзення папярэдняй канферэнцыі, адбылося шмат падзей як палітычных (распад СССР, утварэнне СНД), так і эканамічных (лібералізацыя цэн, фарміраванне рынку). Усе яны паставілі перад намі, і студэнтамі ў тым ліку, нямала праблем, звязаных з нашым матэрыяльным становішчам. Уваходжанне Беларусі ў рынак прыкметна адбіваецца перш за ўсё на самых малазабяспечаных слаях грамадства, да якіх адносіцца і студэнцтва.

Як жа сёння абараняе студэнцкая прафсаюзная арганізацыя сваіх членаў, якіх у яе радах налічваецца 4279 чалавек з 4306 студэнтаў ГДУ? Як у працэсе ажыццяўлення сваіх абарончых функцый яна праяўляе клопаты аб стварэнні здаровых і бяспечных умоў вучобы, быту? На якіх умовах прафсаюзная студэнцкая арганізацыя будуе свае ўзаемаадносіны з рэктаратам? Гэтыя і многія іншыя пытанні разглядаліся ў справаздачным дакладзе прафкома студэнтаў, з якім выступіла яго старшыня Н. І. Колтышава.

Прафсаюзы сёння, адзначалася ў дакладзе, адно з самых масавых фарміраванняў, закліканых абараняць інтарэсы сваіх членаў у грамадстве. Наша пярвічная прафсаюзная арганізацыя ўліваецца ў састаў галіновага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, уваходзіць у Асацыяцыю прафсаюзных арганізацый універсітэтаў і ў Асацыяцыю студэнцкіх прафсаюзных арганізацый. А ў чэрвені г. г. у Мінску была арганізавана Асацыяцыя прафсаюзных арганізацый ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларусі. Яна створана з мэтай праўдзення сумесных дзеянняў па абароне інтарэсаў студэнцкай і навучэнцкай моладзі.

Якое сацыяльнае самаадчуванне студэнта ў нас сёння? Стыпендыя складае 800 руб. і 1000 руб. у студэнтаў матэматычнага факультэта плюс 50% ад размеру стыпендый за пражыванне ў зоне радыялагічнага кантролю, плюс 155 руб. з фонду Чарнобыля. Студэнткі-маці (іх у нас 149) атрымліваюць дапамогі: на нараджэнне дзіцяці — 3000 руб., за своечасовы зварот да ўрача і выкананне патрабаванняў у час цяжарнасці — 1000 руб., штомесячная дапамога — 1200 руб. Кампенсацыя за пражыванне на прыватных кватэрах выплачваецца ў размеры 250 руб. в месяц.

На чарговай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь разгледжана пытанне аб мінімальнай заработнай плаце, якая вызначана ў размеры


**(Заканчэнне на 2-й стр.).**


## БЕЗ 5 ПРАЦЭНТАЎ НАДБАЎКІ

**У папярэднім нумары нашай газеты быў змешчаны матэрыял аб павышэнні з 1-га верасня г. г. заработнай платы прафесарска-выкладчыцкаму, лабаранцкаму саставу, некаторым іншым катэгорыям работнікаў універсітэта. У асобных членаў калектыву ГДУ ён выклікаў дадатковыя пытанні. Тлумачэнні і дапаўненні па іх дае вядучы эканаміст планава-фінансавага аддзела універсітэта В. ЛЮБЕЗНАЯ:**

**— У адпаведнасці з пунктам 2 пастановы Дзяржкампрацы ад 29.02.92 г. № 9 дазволена кіраўнікам устаноў павялічваць або памяншаць, пры неабходнасці, да 5% устаноўленыя ў адпаведнасці з Адзінай тарыфнай сеткай аклады кіраўнікоў, спецыялістаў, служачых і рабочых скразных прафесій. З 1 мая 1992 г. пасадавыя аклады вучэбна-дапаможнага персаналу універсітэта (загадчыкаў вучэбных лабараторый, старшых лабарантаў, лабарантаў, спецыялістаў інфармацыйна - вылічальнага цэнтра) былі павялічаны на 5%. З 1 верасня бягучага года ў адпаведнасці з пастановай Дзяржкампрацы Рэспублікі Беларусь ад 30 верасня 1992 г. № 47, гэтым катэгорыям работнікаў былі павялічаны аклады ў 1,3 раза без 5-працэнтнай надбаўкі.**

*Рэспубліканская канферэнцыя*

## ПА ТВОРЧАСЦІ ЯКУБА КОЛАСА

Шырокая грамадскасць рэспублікі, шматлікія прыхільнікі багатай творчай спадчыны народнага песняра Беларусі Якуба Коласа з глыбокай пашанай да выдатнага мастака слова адзначылі 110-годдзе з дня яго нараджэння. Сярод разнастайных мерапрыемстваў важнае месца заняла рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя, прысвечаная гэтай знамянальнай даце. Яна была арганізавана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Мінскім гарвыканкомам. У яе рабоце прынялі ўдзел многія вучоныя ў галіне філалогіі, педагогі з Мінска, абласных цэнтраў і іншых гарадоў Беларусі.

У першы дзень работы канферэнцыі, 4 лістапада, яе ўдзельнікі на пленарным пасяджэнні заслухалі чатыры даклады, якія закраналі асноўныя аспекты творчай дзейнасці Якуба Коласа. З імі выступілі дэкан філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта, член-карэспандэнт Акадэміі навук Беларусі, прафесар А. А. Лойка, загадчыкі кафедр БДУ прафесар Л. М. Шакун і дацэнт З. Б. Барановіч.

Затым мінчане і іх госці з вялікім задавальненнем наведалі музей Я. Коласа.

На наступны дзень канферэнцыя працягвала работу па секцыях, на якіх было заслухана і абмеркавана каля 40 навуковых паведамленняў. Сярод іх — «Анамастычныя назвы ў творчасці Якуба Коласа» загадчыцы кафедры беларускай мовы нашага універсітэта А. А. Станкевіч і дацэнта гэтай жа кафедры В. А. Ляшчынскай, «Якуб Колас — педагог» — прарэктара ГДУ па завочнаму навучанню М. М. Воінава і дацэнта кафедры беларускай літаратуры В. І. Смыкоўскай.

Трэці дзень канферэнцыі цалкам быў адведзены экскурсіі па коласаўскіх мясцінах.

Рэспубліканская канферэнцыя яшчэ раз засведчыла, што творчасць Якуба Коласа па-ранейшаму прыцягвае вялікую ўвагу, захапляе чытачоў розных узростаў і шматлікіх яе даследчыкаў.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў філалагічнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі ДЗМІТРЫЕВА Міхаіла Афанасьевіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук.**

* * *

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты горача віншуюць загадчыка кафедры агульнай фізікі ЛІНА Дзмітрыя Рыгоравіча і загадчыка кафедры алгебры і геаметрыі МАНАХАВА Віктара Сцяпанавіча з выпадку прысваення ім Міністэрствам адукацыі Расійскай Федэрацыі вучонага звання прафесар.**

* * *

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў матэматычнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры матэматычнага аналізу ЧАРТОК Святлану Іванаўну з выпадку зацвярджэння яе ВАКам у вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.**

* * *

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў эканамічнага факультэта горача віншуюць асістэнтаў кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці КРАВЕЦ Людмілу Міхайлаўну (навуковы кіраўнік — прафесар В. А. Цішчанка) і НІКІФАРАВА Аляксея Яўгенавіча (навуковы кіраўнік — дацэнт У. П. Бабына) з паспяховай абаронай дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.**

* * *

**Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта, калектыў падрыхтоўчага аддзялення горача віншуюць намесніка дэкана факультэта падрыхтоўкі да ВНУ і прафарыентацыі ст. выкладчыка кафедры беларускай літаратуры ЯЦУХНУ Віктара Іванавіча з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.**

# РОДНАЯ ЗЯМЛЯ НАТХНЯЕ...

**Да 70-годдзя з дня нараджэння МІХАСЯ ДАНІЛЕНКІ**

СЯРОД нашага народа добра вядома паданне аб тым, як сустрэліся тры падарожнікі. Доўгім і цяжкім быў іх шлях... Стаміліся і прыселі адпачыць. Раптам чуюць спеў: а хто спявае — зразумець не могуць. Першы і кажа: «Жаваранак». «Не, — сцвярджае другі, — гэта шум лісця ў лесе». А трэці ўпэўнена заявіў: «Гэта спявае наша зямля... Тут зямля такая!».

І сапраўды, на дзівоснай гомельскай зямлі гучалі і гучаць самабытныя і арыгінальныя песні нашых пісьменнікаў-землякоў, сярод якіх — і песня Міхася Пятровіча Даніленкі.

Нарадзіўся М. П. Даніленка ў вёсцы Ястрабка Лоеўскага раёна ў сялянскай сям'і. Калі будучаму пісьменніку споўнілася тры гады, бацькі пераехалі на новае месца жыхарства ў пасёлак Бодры (селішча, якое часта называлі Княжамі. Кажуць, некалі там жыў князь). Закончыў Баршчоўскую школу-семігодку. Любоў да роднага слова, працавітых чалавечых рук прывіў маленькаму Міхасю настаўнік матэматыкі Васіль Пятровіч Язерскі.

З дзяцінства будучы пісьменнік захапляўся творамі Я. Маўра і нават пачаў пісаць пад іх уплывам. Пасля паступлення ў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча М. П. Даніленка ўсё часцей дасылае свае творы спачатку ў газету «Зара камуны», а пазней — «Бальшавік Палесся», у якой была надрукавана яго замалёўка «Баравым шляхам».

Пасля заканчэння педагагічнага вучылішча Даніленка быў прызваны ў Чырвоную Армію. Трапіў на Паўднёва-Заходні фронт, дзе і прыняў першае баявое хрышчэнне. У 1942 годзе Міхась Пятровіч быў кантужаны і апынуўся ў палоне, адкуль у 1944 годзе, разам са Сцяпанам Халайчавым, грэкам па нацыянальнасці, яму ўдалося выратавацца і ўступіць у дзеючую армію. У галодным 1945 годзе вярнуўся ў родныя мясціны, працуе ў Казярожскай семігадовай школе. Завочна вучыцца ў Гомельскім настаўніцкім інстытуце. З 1952 года працуе ў рэдакцыі газеты «Гомельская праўда» аж да выхаду на заслужаным адпачынак.

З-пад пяра Міхася Пятровіча выйшлі зборнікі прозы «Мая песня», «Майская навальніца», «Наваселле», «Наш дом», «Запаветны акіян», «Маці Мар'я», «Журлівіца», «Родная зямля» (аднатомнік «Ключы бабулі зімы»). У Маскве ў аўтарызаваным перакладзе Э. Карповіча выйшлі кнігі «Заветный океан» і «Мать Марья», якія прынеслі вядомасць і папулярнасць пісьменніку і сталі значнай з'явай у гісторыі беларускай савецкай літаратуры.

У цэнтры ўвагі пісьменніка — просты чалавек з яго клопатамі і турботамі, чалавек, улюбёны ў працу, прыроду, родную вёску. Адчуваецца добрае веданне жыцця гэтай вёскі, яно арганічна спалучаецца з філасофскім асэнсаваннем тых вялікіх і незабыўных падзей вайны, сведкам і ўдзельнікам якіх быў сам пісьменнік, з вострымі і надзённымі праблемамі сучаснасці. Асабліва прываблівае ў гэтых адносінах зборнік «Наш дом». Людзі заўсёды радуюцца новым дамам, у якія засяляюцца. У святочным настроі і настаўніца Ганна Макараўна Раеўская — чалавек шчырага сэрца, прыгожай душы. Заслужаная настаўніца пакутуе ад таго, што ў сям'і вырас непрыстойны малады чалавек, яе сын. Праца вылечвае кожнага чалавека, гоіць яго раны. Яе жыватворную сілу і сцвярджае М. Даніленка ў многіх сваіх творах.

М. Даніленка даўно і надзейна заваяваў сабе славу як дзіцячы пісьменнік. У кніжках «Вернасць слову» і «Зачараваны гарлачык», «На вуліцы сонечнай», прысвечаных маленькаму чытачу, празаік сцвярджае думку аб вернасці дадзенаму слову, старанных адносінах да вучобы і працы, вернасці дружбе, чэснасці, павазе да людзей старэйшага ўзросту. Ён вучыць маленькіх чытачоў любіць сваю Радзіму, свой народ, быць заўсёды пільным, дапамагаць старэйшым. У кожным творы пісьменніка адчуваецца яго сардэчная любоў да маленькіх чытачоў, глыбокае разуменне іх непаўторнага свету.

Усе 12 апавяданняў зборніка «Зачараваны гарлачык» звязаны адной тэмай — любоўю да матчынай зямлі, гонарам за чалавека-працаўніка. У апавяданні «Самая галоўная работа» празаік сцвярджае высакароднасць прафесіі печніка, шафёра, дамашняй гаспадыні. А ў «Маміным памочніку» паэтызуе на першы погляд непрыкметную прафесію цялятніцы. У кожным апавяданні зборніка адчуваеш прыхільнасць аўтара да маленькіх чытачоў, добрае веданне іх псіхалогіі, трывог дзіцячага сэрца.

Меладычнасць і напеўнасць радка М. Даніленкі арганічна спалучаецца са значнасцю думкі, філасофскімі абагульненнямі. Яго проза — гэта мастацкае ўсведамленне сваіх грамадзянскіх абавязкаў перад народам, землякамі, маленькімі чытачамі. Асобныя творы пісьменніка друкаваліся на латышскай, украінскай, польскай мовах.

Вядомы Міхаіл Пятровіч і як крытык.

Сёння М. Даніленка актыўна ўдзельнічае ў літаратурным жыцці нашай рэспублікі. Сведчанне гэтаму яго «Абразкі», надрукаваныя ў штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», твор, якім пісьменнік вяртаецца ў памяць, узнаўляе родныя краявіды Гомельшчыны, палескай зямлі.

70 гадоў — гэта тая дата, на падставе якой ужо можна сказаць, што зробленае Міхасём Пятровічам — тая крынічка, чыстыя воды якой уліваюцца ў нашу агульную раку і звіняць цудоўнай песняй на нашай гомельскай зямлі. Хочацца верыць, што гэтая песня будзе гучаць яшчэ доўга-доўга.

Плёну Вам, паважаны Міхась Пятровіч, творчага неспакою, здароўя і ўсяго самага найлепшага!

**В. ГЕНАШ,**
**асістэнт кафедры беларускай літаратуры.**

# «ГОМЕЛЬСКАЙ ПРАЎДЗЕ» — 75 ГАДОЎ

**12-га лістапада ў калектыва рэдакцыі абласной газеты «Гомельскай праўды» — знамянальная падзея: адбудзецца ўрачыстасць, прысвечаная 75-годдзю з дня выхаду ў свет яе першага нумара. З гэтай нагоды ў адрас юбіляра паступаюць шматлікія віншаванні. Да іх далучаюцца калектыў нашага універсітэта і супрацоўнікі яго шматтыражкі. Мы шчыра жадаем журналістам газеты-юбіляра плённай творчай працы, якая б садзейнічала паспяховаму вырашэнню ўсіх складаных задач, што стаяць у нашым цяперашнім жыцці.**

# «АНУ, АКТАВАЯ ЗАЛА!»

— у 12.00 (аўд. 1-7):

Агітбрыгада запрашае чытальнікаў, салістаў, парадыстаў і ўсіх, адчуваючых сябе ўпэўнена ў любым сцэнічным жанры, звяртацца да мастацкага кіраўніка клуба. **Тэл. 57-33-30.**

Натуральна, што не кожны валодаючы артыстычнымі здольнасцямі, музычнай адукацыяй, рэжысёрскімі схільнасцямі абавязкова сам прыйдзе да нас. Хтосьці пасаромеецца, хтосьці не верыць у свае здольнасці, а бывае, што не верачь неабходнаму ўзроўню заняткаў у клубе і наогул гэтай задуме, быць сярод захопленых. Для гэтага штогод традыцыйна студэнцкі клуб праводзіць конкурс «Ану, першакурснік!» Такім чынам, у гэтае самае цікавае мерапрыемства года аказваюцца ўцягнуты ўсе студэнты І курса. Звычайна менавіта тады прыходзіць шмат моладзі. Тут — самадзейныя спевакі і танцоры, чытальнікі і парадысты, будучыя тэатралы і дыскжакеі, мастакі і сцэнарысты. Ім заўсёды знойдзецца занятак па душы. У студэнцкім клубе на гэты конт адзіная думка — таленавіты кожны, неабходна толькі дапамагчы праявіцца і развіцца гэтаму таленту. Гэта дапамагае ў жыцці. У наш час так не хапае запалу, аптымізму, маральнага і духоўнага задавальнення.

На жаль, студэнцкі клуб да гэтага часу не можа назваць дня першага мерапрыемства. Яшчэ больш ускладнілася работа тым, што адзіная актавая зала ўсё яшчэ ў рыштаваннях. У сэрцах работнікаў клуба і ўдзельнікаў самадзейнасці цепліцца надзея паказаць свае праграмы на сцэне універсітэта яшчэ ў гэтым — 1992 годзе. А рэпетыцыі, у сваю чаргу, праводзяцца ва аўдыторыях 1-7 і 1-8 вучэбнага корпуса № 1 ужо з верасня, і творчыя планы не мяняюцца. Наперадзе «Тыдні факультэтаў», дыскатэкі, Навагоднія балі, шоу-праграмы «Містэр універсітэта» і шмат іншага, і, канешне, конкурс «Ану, першакурснік!», падрыхтоўка да якога пачалася ўжо.

Вера ў неабходную патрэбу нашай з вамі творчасці дапамагае нам у гэтай нялёгкай працы, нягледзячы на тое, што сёння мы гаворым не «Ану, першакурснік!» (гэта абавязкова адбудзецца пазней), а заклікаем «Ану, актавая зала!» — справа за табой.

**М. ШЫРЫНКІНА,**
**мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.**



**НА СНИМКЕ: занятия с китайскими студентами ведет заведующая кафедрой русского языка для иностранных учащихся Г. А. Довгяло.**

Фото **В. Чистика.**

В наш университет приехали на учебу 25 юношей и девушек из Китая, которые будут изучать здесь русский язык.

Первыми впечатлениями о г. Гомеле, нашем ВУЗе, о том, как сбываются мечты стать преподавателем русского языка, рассказами о своей далёкой Родине делятся сегодня со страниц нашей газеты китайские студенты.

# ГОСТЕПРИИМНЫЙ ГОРОД

Я первый раз приехал в Гомель. В Китае мне рассказывали, что Гомель — это большой и красивый город.

Когда я вышел из поезда, то увидел современный город: широкие улицы, высокие здания.

Здесь меня окружают добрые люди, о которых можно сказать очень много теплых слов. В первую очередь, это преподаватели, которые часто помогают нам и заботятся о нас.

**ХАНЬ ВО.**

# О МОЕЙ РОДИНЕ

Наш город называется Фушун. Это город тяжёлой промышленности. Еще его называют угольной столицей. Известен он и своим янтарём. Если бы вы были в нашем городе, обязательно купили бы украшения из него. Это — лучший сувенир. Производят у нас и товары лёгкой промышленности, но немного.

В нашем городе много парков, которые очень украшают его. Летом еще можно отдыхать в районе Сархуского вида, в котором есть много здравниц.

В городе есть церкви, но их мало. Каждый день люди ходят туда и молятся о счастье.

В г. Фушун много универмагов. Там обычно продают наряды и красивые подарки. Люди называют их Домом изящных товаров.

Я считаю, что мой город красивый. Он еще молодой и будет строиться и расти.

**ЛИ ЦЗИН.**

# МЕЧТА СБЫВАЕТСЯ

В детстве я хотела быть врачом, учёным. Но когда стала постарше, решила быть преподавательницей.

Мой отец — преподаватель русского языка. Он окончил университет в 60-х годах. Тогда он очень хотел быть переводчиком. Но жизнь изменила его планы. Он является учителем до сих пор. Он учит много студентов. Кто-то из них уже стал учителем, кто-то будет преподавателем, а кто-то переводчиком. Они делают большие успехи в работе и учебе.

Когда мне было 16 лет, я начала изучать русский язык в средней школе. А когда окончила институт, я опять здесь продолжаю изучать русский язык. Я надеюсь, что буду преподавателем, как мой отец. Я уверена, что в будущем мои студенты будут делать все для своей Родины. Это моя большая мечта и мое большое счастье.

**ВАН БЭЙ.**

